№ 9 (125). Вільня, 5 Красавіка 1938 г. Год X.



DA SPRAVY POLSKA-BIEŁARUSKICH ADNOSINAŬ

Padziei ŭ palitycy apošnim časam raźvivajucca niazvyčajna chutka. Ŭvieś śviet žyvie jašče pad uražańniem najvialikšaha skoku Hitlera. Dałučeńnie Aŭstryi da Niamieččyny, hramavyja Hitleraŭskija pramovy ab adbudovie vialikaje Hiermanskaje Imperyi i pachodzie na Ŭschod, šmat kaho tryvožać. Nia dziva tady, što i polskija palityki i publicysty asabliva žyva abhavarvajuć plany na budučyniu i rol Polščy.

Maładyja kanservatyŭna-pravicovyja palityki, zhurtavanyja kala časapisu „Polityka", vyrazna pišuć u № 8 z 25.III.38, što „tolki nad Kaspijskim i Čornym moram možam šukać adkazu na Anschluss—pryłučeńnie Aŭstryi da Niamieččyny... Na rašučyja źmieny jašče nie nastupiŭ čas. Dasiul my nie zmahli hetaj źmieny padhatavać ani zvonku, ani ŭnutry haspadarstva, tut imienna nie zmahli pryhatavać sabie sajuźnikaŭ da budučaj raspravy z Rasiejaj. Dziela hetaha adzinym siańnia realnym adkazam na zdabyćcio Niamieččynaj 7 milijonaŭ hramadzian za hranicami svajho haspadarstva było-b zdabyćcio dla našaj haspadarstviennaj idei 7 milijonaŭ hramadzian unutry haspadarstva. Majem na dumcy nacyjanalnyja mienšaści..."

Prypaminajem, što „Polityka" (raniej „Bunt Młodych") staić za adradžeńnie Jahajłaŭskaj idei, za parazumieńnie Polščy z inšymi narodami, a miž imi z Ukraincami, Biełarusami i Litoŭcami na realnaj padstavie, pryznajučy dvustaronna vymohi vypływajučyja z pryncypaŭ sučasnaha nacyjanalizmu. „Polityka" staić za stvareńnie polska-ukrainska-biełaruskaha bloku, katory abniaŭ-by paśla prybałtyckija haspadarstvy, a mahčyma Rumyniju i Madziarščynu i addzialaŭ-by Niamieččynu ad SSSR.

Zusim padobny pahlad vyražaje ŭ „Kuźnicy" (№ 7 z 1-15.IV.38) P. Musioł—b. kamisar „Związku Nauczycielstwa Polskiego", ćvierdziačy, što zasłuha razhromu balšavizmu pavinna prypaści nia Niemcam, a Polščy i jejnym susiednim sajuźnikam. „Razhrom Savietaŭ — piša P. M. — pryniasie volnaść pierad usim Ukrainie i Biełarusi". Ale p. Musioł nijak nia moža rasstacca z dumkaj asymilacyi słavianskich mienšaściaŭ na „Kresach Wschodnich" i hetym kasuje ŭvieś svoj plan, nie pačaŭšy jaho jšče pravodzić.

Sprava ŭschodniaje palityki ležyć na sercy i viedamamu polskamu publicystu dr. J. Bobžanskamu. Jon, razhladajučy ŭschodniuju polskuju palityku ŭ № LVIII z 1938 h. „Naszej Przyszłości", dachodzić da vyvadu, što dla Polščy asabliva niebiaśpiečnymi źjaŭlajucca Ukraincy, katoryja pašyrajuć svaje ŭpłyvy na Biełarusaŭ. Dziela taho, kab pazbycca varožych ukrainskich upływaŭ da Polščy siarod Biełarusaŭ, dr. J. Bobžanski ŭvažaje za patrebnaje, kab „polskaja" „kresovaja" palityka raz nareščie źviarnułasia praciŭ usiaho, što jość ukrainskim, i zakinuć usie ŭ hetym kirunku eksperymenty, a zatoje padtrymać usio, što choča być i nazyvacca ruskim*) i biełaruskim, biaz roźnicy ŭ vieravyznańni".

Padychod dr. J. B., jak bačym, „cikavy", ale nia budziem hetym razam nad im zatrymlivacca.

Zakranuŭ spravu polska-biełaruskich adnosinaŭ i viaskovy orhan O.Z.N. časapis „Wieś Polska" ŭ pieradavicy № 11 z 13.III.38. „Wieś Pol." siahaje daloka ŭ minuŭščynu da „pryhožych—jak piša—tradycyjaŭ Polski Jagielońskiej,..." kali „Palaki, Litoŭcy i Biełarusy ŭ braterskaj zhodzie tvaryli supolna kulturu ŭschodnich ziamiel"... Pryčynu ŭsich nieparazumleńniaŭ biełaruska-polskich bačyć „W. P." u prablemie nadziełu ziamloj biełaruskich sialan i adnosinach da hetaj spravy polskich abšarnikaŭ, a tak-ža ŭ „niedociągnięciach pierwszych lat niepodległego bytu..."

„Chočučy apiorci mahutnaść haspadarstva na tryvałych padstavach—piša dalej „Wieś Pol."—nia možam spakojna hladzieć, jak hetaja vialikaja masa viaskovaha nasielnictva (biełaruskaha — J. N.) siadzić u pasyŭnaści i niedavierčyvaści. Hetuju pasyŭnaść i niedavierčyvaść musim pierałamać... Padstavaj parazumleńnia i supracoŭnictva jość pierad usim sprava abarony kraju, zrazumieńnia kaniešnaści supolnaj abarony baćkaŭskaha zahonu, z katoraha ŭschodni vorah achvotna-by nas vyžyŭ. Dalej idzie supolnaja praca nad padniaćciem haspadarčym i kulturnym zaniadbanych „ziem kresovych". — Nia chočam pazbaŭlać „ludu białoruskiego" jaho movy i viery. Chočam, kab kultura „ludowa białoruska" była tak, jak kultura „ludowa" inšych ziamiel Rečypaspalitaj—skarbnicaj, z kato raj čerpaje kultura „ogólno-narodowa..."

Vielmi pryhoža... Ale vybačcie, što zapytajem, što značać henyja słovy: „kultura ludowa białoruska" takaja, jak inšych ziamiel Rečypaspalitaj? Ci heta maje značyć, što panovie stavicie Biełarusaŭ u ad-

*) Słova „ruski" ŭžyvaje tut dr. J. B. nia ŭ sensie rasiejski, a pad im razumieje čaścinu ukraincaŭ, katoryja, nia jduć razam z usim ukrainskim nacyjanalnym adradženskim rucham. — J. N.

nosinach da Palakoŭ, jak Mazuraŭ, Kujaviakaŭ?.. — Kali tak, to lepš budzie dla dabra Rečypaspalitaj i dla abaronnaści kraju viarnucca da Kanstytucyi Rečypaspalitaj! — Voś-ža Biełarusy ŭ adnosinach da Polskaha Haspadarstva nałožanyja na ich Kanstytucyjaj hramadzianskija abaviazki vykonvajuć, dajuć Haspadarstvu žaŭnieraŭ, płaciać padatki i h. d. Da raźviazańnia prablemy astajecca: vykonyvańnie nacyjanalna-kulturnych pravoŭ, zahvarantavanych Polskaj Kanstytucyjaj usim nacyjanalnym mienšaściam, a ŭ ich liku i Biełarusam, i raźvićcio idei harmonijnaha sužyćcia narodaŭ, jak volnych z volnymi i roŭnych z roŭnymi...

Treba skazać, što apošnim časam najšyrej spravu parazumleńnia polska-ukrainska-biełaruska-litoŭskaha staviła «Konfederacja Młodych". Viestki ab hetaj arhanizacyi znachodzim u № LVII časapisu „Nasza Przyszłość" (Śnieżań 1937, Varšava), jaki miž inš. hetak pisaŭ:

2.XII.1937 h. u Varšavie adbyŭsia ahulny arhanizacyjny schod novaje arhanizacyi moładzi pad nazovam „Konfederacja Młodych" na asnovie začvierdžanaha haspadarstviennymi ŭładami statutu. — „Užo sam fakt arhanizacyi peŭnaj hrupy moładzi pad ściaham Kanfederacyi—pisała«Nasza Przyszł.»,— jak i začvierdžańnie jaje statutu haspadarstviennymi ŭładami źjaŭlajecca biassprečna pavažnym zdareńniem siarod zakałotu roznarodnych zmahańniaŭ i palityčnych kambinacyjaŭ na abšary našaha haspadarstva. Bo chto biare ŭdzieł u Kanfederacyi Maładych? Pradstaŭniki maładoha, u varunkach užo pavajennych vyrasšaha, pakaleńnia Palakoŭ, Ukraincaŭ i Biełarusaŭ. (Z Biełarusaŭ byŭ tam P. Łastaŭka—*red*). Spadziavanaje jość prystupleńnie i Litoŭcaŭ. Voś-ža moładź čatyroch nacyjanalnaściaŭ... Kanfederacyja Maładych padyjmała ŭ svaim statucie i ŭ prahramovaj ustupnoj deklaracyi štandar zbližeńnia i adpaviednaha abjednańnia nazvanych čatyroch narodaŭ, jak roŭnych z roŭnymi, nie rašajučy zhary budučaj formy hetaha abjednańnia, ale pryznajučy kožnamu z ich prava da ŭłasnaj haspadarstviennaści, žadajučy tolki, kab narody hetyja i ich haspadarstvy trymalisia razam, sprežanyja mnohimi, dabravolna miž sa-boj ustanoŭlenymi, vuzłami dziela akančalnaha vyzvaleńnia z-pad čužoje siły i adporu abjednanymi siłami supolna hroznych niebiaśpiekaŭ z uschodu i zachadu".

Tak bolš-mienš vyhladali namiery Kanfederacyi Maładych. Nia doŭha adnak jana isnavała i pracavała, bo voś na dniach pryjšli viestki z Varšavy, što administracyjnyja ŭłady spynili dziejnaść „Konfederacyi Młodych"...

Urešcie treba adznačyć, što red. K. Čapinski – adzin z hałoŭnych pavadyroŭ P.P.S., u №№ 90 i 95 „Robotnika" sioleta vyskazvajecca procił planu i aryjentacyi „Polityki", red. Uł. Bončkoŭskaha i inš.staronnikaŭ pachodu na Uschod, budavańnia Ukrainy, a taksama i dalejšych u hetym kirunku planaŭ. Bo, kaža red. K. Č., takim čynam Polšč uvodzicca ŭ kruh upłyvaŭ Hitleraŭskaj Niamieččyny. Tymčasam i „Polityka" i red. Bončkoŭski ŭ svajej knižcy „Grunwald czy Pilawce" robiać plany, kab supročstavicca nia tolki Rasiei, ale i Niamieččynie. Ale najcikaviej, što PPS i red. Čapinski, stojačy za sajuz Polšč z Francyjaj, jakaja źviazana sajuzam z SSSR, ścvierdziŭšy ŭ svaich rezalucyjach maralny razkład kamunistaŭ i viedajučy, što Hitler tak-ža cikavicca Ukrainaj i Biełarusiaj, svajho vyraznaha słova ŭ spravie polskaje ŭschodniaje palityki nia kažuć. Navat nia vykazvajucca za tym, kab Francyja ŭsio ž źviarnuła ŭvahu svajmu sajuźniku ŭ Maskvie, što dla dabra ichniaha-ž sajuzu i ŭ imia ludzkaści i demokracyi nia možna rabić u Savieckaj Biełarusi i ŭ Sav. Ukrainie taho, što kamunisty tam robiać, a imienna — ŭsio biełaruskaje i ukrainskaje nistožyć. — Kali-ž nia budzie zdabyvać sabie prychilnaści siarod Biełarusaŭ i Ukraincaŭ Polšč, to buduć zdabyvać ich sabie Niamieččyna i Maskva, jakija pry nahodzie mohuć źmianić svaju palityku da Biełarusaŭ i Ukraincaŭ.

Ab usich-ža vyšej pieraličanych vystupleńniach možna skazać, što źjaŭlajucca i astajucca jany tolki słavami. U kirunku ažyćciaŭleńnia ich, a navat i ŭradavaj deklaracyi ab dobrych adnosinach da nacyjanalnych mienšaściaŭ, „pavinny pryjści — jak pravilna kazaŭ u Senacie 7.III sen. Bečkovič— enerhičnyja vykanańni nia stolki ŭ sensie administracyjnych rasparadžeńniaŭ, kolki naležnaha nastaŭleńnia ŭładaŭ da celaha radu prajavaŭ žyćcia kulturnaha i haspadarčaha mienšaściaŭ u terenie. Bo treba skazać što nie adzin z kiraŭnikoŭ haspadarstviennaha žyćcia robić vialikija pamyłki... i hetak razdražniajuć i adsoŭvajuć ad siabie nacyjanalnyja mienšaści pierad usim

---

Жалейка

СУДЗЬБА

Прысьвячаю Алене Аніщанцы

„На цябе, наша моладзь, надзея,
Нашай сумнай, гаротнай зямлі...

— — — — — — — — — —

Бяры сьветач, ідзі за судзьбінай,
Ідзі з словам сьвятым: Беларусь...“

I.

Васеньняя чорная ноч іграла сваю жалобную мэлёдыю на шыбах вокнаў. Па шкле цяклі ейныя сьлёзы зімныя, як лёд. А ў хаце было цёпла, ясна і прытульна. Ганка сядзела пры стале, разлажыўшы прад сабой кніжку; але ня чытала, думкі разьбягаліся, быццам тое лісьцё з дрэваў, што жаласна шумела за вакном. Сумам зацягвала сэрца матчыная песьня:

„Пеце людзі гарэліцу, а вы гусі воду,
Ой, ляцеце шэры гусі, аж да майго роду. .“

У такт сумнай песьні рытмічна гудзеў калаўрот, а вецер з-за вугла хаты сьвістаў акампаніямэнт:

„Не кажыце шэры гусі, што я тут гарую,
А кажэце шэры гусі, што я тут пануючь...“

Ганка нізка схіліла над сталом галаву, быццам ня бачачы матчыных сьлёз, што паволі каціліся на шэрую кудзелю.

Прад вачыма Ганулькі прасоўваліся абразы раньняе моладасьці, прыпомніла сабе даўно вывучаны верш:

„Ой, кабеткі, вы вясковы,
Ой лялейкі прызавяты,
Вашы твары, як васковы,
Вашы шчочкі сьлязьмі зьмяты...“

Гэта было так даўно, ледзь чытаць Ганка вучылася... У хаце была адна адзіная кніжка: Беларускі Календар. Кніжка поўная незразумелых Ганцы, а так чароўных слоў. Што вечар браў бацька Ганку на калені, і з гэтай цудоўнай кніжкі чытаў вершы. Такая самая была чорная васеньняя ноч, і таксама гудзеў матчын калаўрот. Але тады йшчэ матчын твар быў бела-ружовы, а на чырвоных вуснах блішчэла маладое полымя радасьці і шчасьця.

Pahuby majuć svaju kulturu

Viedamy polski litarat Jury Vyšomirski źmiaściŭ u Vilenskaj polskaj hazecie „Kurjer Powszechny“ (№ 77 z 20.III.1938) vielmi cikavy artykuł ab pryrodnaj sile biełaruščyny. U hetym artykule ścviardžajecca, što biełaruščyna, jakaja nia maje ciapier ani palityčnaha kiraŭnictva, ani matarjalnaha padtrymańnia, asymiluje (vynaradaŭlaje) polskich asadnikaŭ i i vyhaniaje „tutejšuju“ polskuju movu. Hety charakterny artykuł J. Vyšomirski padaje pad zahaloŭkam „Walka z Pahubą;“ padychtavany-ž jon jak sam aŭtor ćvierdzić, dumkaj adnaho vierša polskaj paetki Vandy Dobačeŭskaj ab biełaruskaj vioscy Pahuba.

Pahuba — heta symbal biełaruskich viosak, pradstaŭleny Vandaj Dobačeŭskaj, dzie, pavodle jaje, načami kryčać sovy, za płatami vyjuć hałodnyja sabaki, a złyduchi dušać hałodnych ludziej. Nazoŭ „Pahuba“ vyvodzić V. D. ad biełaruskaha słova pahubić — niščyć.

Jury Vyšomirski zacytavaŭšy ŭ svaim artykule skaz V. Dobačevskaj ab hetaj biełaruskaj vioscy — „Zatracona i Bogu nieluba“, — advažna ćvierdzić, što biełaruskaja vioska śpić, i adnačasna ścviardžaje faktami jaje biełaruskuju mahutnaść, byccam niejkuju niaśviedama — padśviedamuju nacyjanalnuju śviedamaść.

Pry hetym J. V. pytajecca siabie, ci sapraŭdy biełaruskija vioski možna ŭvažać za Pahuby i adkazvaje, što tak. Apiraje heta ćvierdžańnie na prykmietach charaktaru biełaruskaha sialanstva i na jahonaj nacyjanalnaj biełaruskaj stojkaści. Narod u hetych Pahubach—ścviardžaje J. Vyšomirski—niedaviercyvy, zakryty sam u sabie i da čužyncaŭ adnosicca nieachvoča. Ale hetyja Pahuby majuć niejkuju dziŭnuju tajomnuju siłu dziela asymilacyi čužyncaŭ, jakija tam apynucca.

Adzin z faktaŭ hetkaje asymilacyi, padadzieny J. Vyšomirskim, vyhladaje hetak:

—„Voś sakret „Pahuby.“ Ab hetym sakrecie — piša J. Vyšomirski — dumaŭ ja dva hady tamu, kali ŭ adnej miajscovaści ŭ Navahradčynie paznaŭ asablivaha čałavieka. Nia viedaju, ci hetaja miascovaść mieła piać sot žycharoŭ — heta była vioska, jakaja lažała siarod hustych lasoŭ, nad bystraj i pryhožaj rakoj. Navokał jaje — vioski i vioski biełaruskija. Asablivym čałaviekam byŭ ksiondz. Pachodziŭ z Paznanščyny, vučyŭsia ŭ Innsbrucku i ŭ Rymie i žyćciom zakinuty — pasialiŭsia tut jak probaršč, viedama, katalicki, nierazumiejučy ani słova pabiełarusku. Za niekalki hadoŭ paśla taho, kali ja jaho paznaŭ, byŭ jon užo pravasłaŭnym śviaščeńnikam i z kaściola pierajšoŭ u cerkvu. Vučyŭsia zaŭziata i navukova pabiełarusku i, zahubleny siarod dziesiatka Pahub, zbiełaruščyŭsia. Barada, katoruju zapuściŭ, „riasa“ z šyrokimi rukavami—zrabili z jaho inšaha čałavieka. Kazaŭ mnie — piša J. V.— pavažna i ščyra ab idejovych pryčynach svajej pieramieny i — jak vyhladaje — hłybaka vieryŭ, što moža addacca (dziakujučy hetaj pieramienie) niejkaj misii ŭ kraju, dzie pryjšłosia jamu žyć, misii — vidavočna — cyvilizacyjnaj, bo šmat jon raskazyvaŭ ab prymityŭnaści tutejšych ludziej i ab ciažkoj svajej pracy dla hetaha narodu“.—

Tak, cikavy heta fakt i nie adziny. Pakazvaje jon na mahutnaść pryrodnaje siły biełaruskaha narodu, zdolnuju asymilavać ŭ svaim asiarodździ nia tolki polskich asadnikaŭ, ale i šukajučych praŭdy ludziej z vyšejšaj aśvietaj. Heta dakazvaje, što „Pahuby“ majuć svaju kulturu, jakaja ŭ ciapierašnim ahulnym raźvićci ich jość samavystarčalnaj. Vyraźniej —heta ścviardžaje, što biełaruski narod žyvie svaim pryrodnym bytam, zadavalajecca svajoj narodnaj kulturaj, jakuju maje, čužoj kulturaj nie prajmajecca i stojka trymajecca svajho rodnaha, niesupiarečnaha z pryrodnym pravam.

Dziela hetaha patrebnaja nie *„walka z białorutenizacją ludności polskiej“* — jak heta radzić p. Jury Vyšomirski — ale naležnaje, zhodnaje z pryrodnym pravam *kultyvavańnie hetaj niepieramožnaj biełaruščyny*. Treba pravodzić čyhunki, budavać šosy i elektryfikavać Kraj nie dziela baraćby z biełaruščynaj —jak kaža J. V. —ale dziela padniaćcia roŭnia haspadarčaha Pahubaŭ i ŭsiaho ichniaha kraju, raźvivajučy adnačasna ŭ zhodzie z pryrodnym pravam ichniuju nacyjanalnuju kulturu. Nierealnyja i supiarečnyja z pryrodnym pravam dumki ab asymilacyi Biełarusaŭ para ŭžo daŭno zakinuć. **Jp.**

---

slavianskija...“ (Biełarusaŭ i Ukrainca). — Tak, sapraŭdy, choć hetkija małyja vymohi patrebnyja ŭ pieršuju čarhu dziela ŭładžańnia supolnych adnosinaŭ.

J. N.

А сяньня?... Згас ужо стомлены горам мінулых год. Ой, гора-ж бо гора пераносіць вясковая жанчына!..

Ганчыныя думкі плылі быццам васеньнія хмары, зацёмненыя тугой і жалем. Ведала Ганка, чаму так часта сьпявае маці „Шэрыя гусі“. Маці любіла сваю вёску, схаваную ў цені старых дрэваў, нівы расьцягнутыя над берагамі Дзьвіны, але ўсьцяж ёй гаманілі хвалі рэчкі Сьвіслачы і сьніліся вуліцы Менску, агляданыя маладымі вачмі...

— Вазьміся ты за якую работу, што так сядзіш — перабіла Ганчыны думкі маці і на хвіліну спыніла калаўрот, злажыўшы спрацаваныя рукі на каленях.

Ганка ўзварушылася нецярпліва і адсунула ад сябе ўжо колькі разоў чытаную кніжку. Было ёй чамусь сумна, цяжка і жыцьцё ў гэтай хвіліне здавалася нейкім безнадзейным. Хацела штось адказаць маці, але не пасьпела, бо з холадам ветру і дожджу ўбег у хату малодшы брат Ганкі, Вінцусь.

— Божа, дзе ты гэта цягаешся і як ты выглядаеш! — крыкнула з пагрозай маці. Ганка-ж ад стала прыпамінала, як заўсёды:

— Вінцусь, ногі выцірай! — Чуеш, ногі вытры!— Нават бацька адвярнуў галаву з печы і забурчэў:

— Ах, які дурны хлапец! — І застагнаўшы павярнуўся на другі бок.

А „дурны“ хлапец, павесіўшы сярмяжку, з каторай на Ганчыну бяду пацяклі ручайкі, вясёла засьмяяўся. Ягоныя быстрыя, разумныя вочы блішчэлі агнём маладасьці.

— На, Ганка, чытай—сказаў кінуўшы на стол некалькі кніжак.

Дзяўчыне загарэліся вочы радасным полымем і з вялікім зацікаўленьнем чытала назовы кніжак. Перад усім аднак затрымаліся яе вочы на прозьвішчы падпісаным на кожнай кніжцы: Казюк Верас— казалі сьмелыя, энэргічнай рукой пісаныя літары. Казюк Верас?.. Можа ён?..

Быў цёплы дзень верасьня. Высака з яснымі хмарамі плылі ключом жоравы і заводзілі песьню жальбы. Сонца апошнімі блескамі залацілася па пустым полі. Асеньнія думкі налячалі ад пажоўклых бяроз і ўпіваліся ў сэрца... Ганка капала бульбу,—якраз пры дарозе. Людзі зрэдка ехалі і йшлі.


Царкоўнага Сабору ня будзе

У прошлым нумары „Шляху Моладзі“ мы пісалі, што замест ЦаркоўнагаСаборуПраваслаўнае Царквы мае ў Польшчы паявіцца дэкрэт Прэзыдэнта, які ўнармуе царкоўныя справы ў Польшчы. Газэты падаюць, што гэты дэкрэт паявіцца пад канец траўня сёлета, гэта тады, калі ў Варшаву прыедзе румынскі патрыярх Мірон, цяперашні прэм'ер румынскага ўраду. Патрыярх Мірон, падчас пабыту варшаўскага праваслаўнага мітрапаліта Дзяніса ў Румыніі ў верасьні 1937 г., сказаў наступнае: „Мы ведаем, што незадоўга аснаўны закон унормуе палажэньне Праваслаўнае Царквы ў Польшчы.“ Вось гэныя словы маюць цяпер зьдзейсьніцца.

Ходзяць чуткі, што пасьля паяўленьня дэкрэту будзе скліканы Сабор, які мае выканаць адно заданьне — прыняць да ведама і пацьвердзіць дэкрэт Прэзыдэнта.

Варшаўская праваслаўная мітраполія і некаторыя архірэі з гэткай разьвязкай царкоўнай справы зусім згаджаюцца. Яны Сабору ня хочаць, бо на Саборы маглі-б сказаць сваё важкае слова беларусы і украінцы, дамагаючыся належных сабе ў Царкве правоў. Гэта, як відаць, даўно да аднагодных паглядаў на Сабор рашаючых праваслаўных дзейнікаў з дзейнікамі ўрадавымі. Паказвае гэта, што праваслаўныя расейскія дзейнікі паддаюць Царкву пад уплывы сьвецкае ўлады. Аб гэтым Беларусы і Украінцы ведаюць і будуць помніць.

М. Астапчык.



Цымбалы—беларускі народны музычны інструмант.

Я веру...

Абуджаны надзеяю,
І духам часу новага —
Так цьвёрда-моцна веру я
У сілу дня вясновага, —

Калі жыцьцё крыніцаю
Плыве да вёсак, ніў
І будзіцца з зарніцаю
Напеваў пераліў.

І сонца над туманамі
Сьмяецца, разсяе
Праменьні над палянамі
І да жыцьця заве.

Абуджаны надзеяю
Ўстае к жыцьцю мой Край,
Так цьвёрда-моцна веру я
ў вясну, у сонца, ў май.

Аркадзь Заранка.

Хачу спаткаць вясну

Хачу спаткаць вясну,
вясну вясёлых песень,
пасьля цяжкога сну
як сонца край пацешыць.

На сноп яго зары,
на грэбень бору-лесу,
як выйдуць песьняры
і сонца іх асьвеціць.

Сплятуць красы вянок
з маёвых красак, песень,
разьвеюць сум і змрок
што слаліся па лесе.

Хачу спаткаць вясну,
вясну красы і ўсьмеху,
і на крывым шляху
паставіць шчасьця веху.

П. Граніт.

Неадварочвала ніколі галавы з-над шэрай зямлі і штораз ніжэй гнулася пад цяжарам кошыка. .— „Памажы Божа!“— адазваўся нечы мілы, малады голас. — Тады падняла галаву і спаткала зацікаўлены зрок маладога хлапца. Быў адзеты паместаваму, высокі, стройны блёндын... Як зачараваная глядзела ў ягоныя ясныя вочы... Зьняў тады шапку і сказаўшы—„бывайце“—хутка пайшоў, даганяючы воз, на якім былі зложаны падарожныя чамаданы. — Адказала яму—„усяго добрага“,—а ў сэрцы яе нейк дзіўна задрыжэла, быццам разьвіталася яна з сваім шчасьцем, што заблішчэла толькі і згасла, як той залацісты дзень у верасьні. Сінія далі ўсьцяж паўтаралі: бывай, бывай, бывай.. і каціліся дарогай за маладым хлапцом, што ад'яжджаў у места на навуку. Вінцусь сыпаў бульбу ў мяшкі і сьвістаў мэлёдыю „Гарні, гарні бульбу з печы“. Убачыўшы адыходзячага хлапца, запытаў: Знаеш, Ганка, хто гэта? — Не, ня знаю, адказала.

— Гэта-ж Казюк Верас з Дубоўкі. Ён вучыцца ў нейкай земляробскай школе, ужо трэці і апошні, здаецца, год. Мудры хлапец, каб ты ведала якую мае ён павагу сярод усей ваколічнай моладзі...

Гэтыя словы Вінцуся прыпомніла цяпер Ганка. І вось перад ею ляжалі кніжкі Казюка Вераса, чытаныя ўсей ваколічнай моладзяй. Беларускія кніжкі, кніжкі ў роднай мове бацькоў, дзядоў і прадзедаў. Гэта навасьць для Ганкі — яна йшчэ іх ня знала. Была ў чужым далёкім месьце ў дзядзькі. Мела польскую школу і польскае асяродзьдзе. У маладой душы ня было месца на любоў да вёскі і роднага краю. Але як памёр дзядзька, дык жыцьцё пайшло зусім іншай дарогай. Скончылася навука і ўсе лятуценьні аб „лёгкім хлебе“. Вярнулася да бацькі. Навучылася працаваць і навучылася любіць вёску і сваіх людзей. Дагэтуль аднак жыцьцё яе ня мела глыбейшага зьместу, радасьці і пачуцьця карыснасьці ў жыцьці сваім і другіх. І таму жыцьцё часта здавалася ёй пустым і безнадзейным. Дзе шукаць сьвятла і шчасьця? — пытала сябе. — А можа яно зачараванае ў кніжках гэтага незнаёмага, а так дзіўна блізкага хлапца... Раскрывае карты кніжкі. — Беларуская паэзія... Сэрца б'ецца моцна, што раз мацней, бо душа

ЛІТОЎСКАЕ ГАСПАДАРСТВА


Пасьля 20-цігадавога перарыву ўва ўсякіх зносінах між Літвою і Польшчай, пасьля доўгай глухой мярцьвечы на літоўска-польскай граніцы і пасьля ведамага сёлетняга выпадку каля Марцінканцаў — адносіны між Літвою і Польшчай паволі наладжваюцца. У Варшаве ўжо ўрадуе дыплёматычны прадстаўнік літоўскага ўраду пасол палк. К. Шкірпа, а ў Коўне такі-ж прадстаўнік польскага ўраду пасол Харват. У Аўгустове каля Горадні адбылася польска-літоўская канфэрэнцыя ў справе наладжаньня супольных бяспасярэдніх зносінаў паштовых, а таксама камунікацыі. З гэтых прычынаў польскія газэты і часапісы перапоўненыя рознымі весткамі і артыкуламі аб Літве, з якіх скарыстаем і мы, каб яшчэ бліжэй пазнаёміцца з суседнім гаспадарствам братняга Літоўскага Народу. Зьвернем тут увагу перад усім на геаграфічнае палажэньне і гаспадарчае жыцьцё, бо аб жыцьці культурным пісалі мы нядаўна (гл. „Шлях Моладзі“ № 5(121) з 25.II.38) з прычыны 20-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Літвы.

Сучаснае незалежнае Літоўскае Гаспадарства агулам займае 56.000 квадр. кілёмэтраў і ёсьць большым ад Эстоніі і Латвіі. Гранічыцца яно з Польскім Гаспадарствам, Нямеччынай, Латвіяй і Балтыцкім морам. Галоўнымі рэкамі зьяўляюцца Нёман і Вяльля. Лік насельніцтва перавышае 2,500,000. На 1 кв. клм. прыпадае 45 асоб, у Польшчы-ж жыве на 1 кв. клм. 86 асоб. Літоўцы — народ стары, заўзяты, працавіты, рэлігійны, глыбака любіць свой край, сваю мову і культуру. Яны, так як і Беларусы, пераважна земляробы, па веравызнаньню ж — ў 90 прац. каталікі. Многа літоўцаў, як ведаем, жыве ў сучасным Польскім Гаспадарстве, а таксама ў Латвіі, Прусіі, Амэрыцы і інш. краёх.

Сярод нацыянальных меншасьцяў у Літ. Гаспадарстве перад усім вырожніваюцца Жыды, Палякі і Беларусы. Трэба сказаць, што пры літоўскім урадзе ў Коўне праз некалькі год існавала спэцыяльнае міністэрства для беларускіх справаў. Пасьля быў у Коўне Беларускі Цэнтр, дзякуючы якому было выдана там шмат цэнных беларускіх кніжак, а між іншым вялізарная „Гісторыя Беларускай (Крыўскай) Кнігі“ В. Ластоўскага, а таксама ягоны-ж „Расейска - Беларускі Слоўнік“. Цяпер у Коўне ёсьць Беларускае Культурнае Таварыства, Беларускі Нацыянальны Камітэт, Беларускі Студэнцкі Саюз і інш. бел. арганізацыі і установы.

Найбольшым местам Літоўскага Гаспадарства ёсьць Коўна, у якім жыве 106,794 асобы і якое ёсьць цяпер галоўным літоўскім цэнтрам. Другім найвялікшым местам зьяўляецца Клайпэда з 38,549 жыхарамі, каторая ёсьць галоўным літоўскім портам.

Літоўцы, як ужо было сказана, пераважна земляробы і дзеля гэтага яны зараз пасьля заснаваньня свайго гаспадарства, галоўную ўвагу зьвярнулі на ўпарадкаваньне сялянска-гаспадарскае справы. Перад усім узяліся за зямельную рэформу, комасацыю, мэліорацыю, коопэрацыю і арганізаваньне экспорту-вывазу земляробска - сялянскіх прадуктаў заграніцу. Сяньня ўжо 6,440 вёсак скамасаваных, пры тым беззямельныя і малазямельныя дасталі належныя надзелы зямлі. Нескамасаваных-жа ёсьць толькі 1,860 вёсак. Мэліорацыя праведзена на абшары 379,659



К о ў н а

чуе нешта сваё, дарагое і блізкае. Вось тыя самыя вершы, што чытаў калісь бацька:

„На высокай гарэ, дзе ніхто не арэ,
Толькі птушка—арол дзе садзіцца...“

О, як жыва вяртаецца тое самае ўражаньне...

„Люблю я край, старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла..“

Чытаць вучыў на гэтым вершы яе бацька і доўга памятавала першыя словы. Да канца не дачытала, календар ня ведама як загубіўся тады, як чытала на лугу з дзяцьмі суседаў. Як-жа часта лятуцела, каб ён знайшоўся і каб змагла гэты цудоўны верш перасылябізаваць да канца. Не знайшла аднак. І міналі гады, плылі дні, як хвалі рэкі, аж заглушылі песьню новага дня... Згубіўся беларускі календар; іншыя-ж кніжкі былі ў чужой мове. Захаплівалася тады творамі чужых песьняроў, карміла душу хлебам чужых ідэяў. Але вось прыйшла хвіліна і знайшла сваю родную песьню, дзівячыя лятуцені могуць споўніцца, можа чытаць далей, да канца гэны цудоўны верш:

„Люблю народ наш беларускі,
Іх хаты ў зеляні садоў“...

Цяпер Ганцы здавалася, што дагэтуль ейнае жыцьцё было падарожай па чужых прыгожых краінах, а сяньняшні вечар гэта туга і шчасьце павароту ў свой родны край, у прасторы родных палёў. І здаецца ей, што знайшла частку сваей душы, каторую згубіла прад гадамі на гэным лугу. Будзілася да новага жыцьця. Разгаралася полымя новых лятуценьняў, нязнанай любові і новых імкненяў.

Плывуць гадзіны. Ганка ад кніжкі не адрываецца. Сьпяць ужо ўсе. Так ціха. На'т вецер і дождж сьціхлі за вакном. А душа ейная, залітая чарам беларускай паэзіі, лавіла што-раз новыя думкі:

„На цябе, наша моладзь, надзея,
Нашай сумнай гаротнай зямлі...
Бяры сьветач, ідзі...“

За вакном у шэрым тумане восені чарнелі плямы вясковых хат. Па небе плылі цёмныя хмары. Паволі з-за лесу выплываў вялікі месяц і штораз больш асьвятляў вёску. У глухой цішыні, паўтараўся шопат: *„Бяры сьветач, ідзі“*...

(д. 6.)

гэктараў. Заграніцу вывозяць літоўцы збожа, мяса, малочныя прадукты, яйкі, лён, коні і іншыя — агулам на больш як 150 мільёнаў літаў*) у год. Галоўнымі гаспадарча-гандлёвымі арганізацыямі зьяўляюцца: 1. „Летукіс“ — Саюз Спажывецкіх і Земляробскіх Коопэратываў, каторы скуплівае ад сялян і вывозіць заграніцу збожа (мае ён свае вялікія элеватары і магазыны); 2. „Пеноцэнтрас“ — Саюз Малачарскіх Копэратываў, які скуплівае малако, прадукуе масла, сыры і высылае заграніцу; ён-жа скуплівае і высылае заграніцу яйкі, яблыкі, грушы і інш.; 3. „Маістас“—акцыйнае таварыства, каторае займаецца прадукцыяй і вывазам іх заграніцу. „Маістас“ скуплівае і вывозіць заграніцу так-жа і жывыя сьвіні, скаціну і хатнія птушкі.

Агулам гаспадарка ў Літоўскай Дзяржаве, што ўсе сьцьвярджаюць, вядзецца ўмела. *Свае кіраўнікі, свае працаўнікі дбаюць і стараюцца, каб жыцьцё ўладзіць як найлепш і каб народ свой задаволіць.* І дзеля таго Літоўцы, ня гледзячы на векавую няволю, якая іх прыгнятала— аднача́сна з Беларусамі — за кароткі час незалежнага існаваньня палепшылі сваё жыцьцё, як у сэнсе духова-культурным, так і матарыяльным.

Я. Н.

*) Літ — гэтак называюцца літоўскія грошы. 1 літ раўняецца 88 польскім грошам.

ШТО ЧУВАЦЬ

— У канцы сакавіка ў **Польшчы** скончылася звычайная сэсія Сойму і Сэнату, у часе якое разгляданы быў перад усім гаспадарственны бюджэт. Пасьля сэсіі старшыня ўраду ген. Славой-Складкоўскі прадставіў Пану Прэзыдэнту да выясьненьня справу далейшага існаваньня, або адстаўкі ўраду. П. Прэзыдэнт І. Масьціцкі пастанавіў, што ўладай у Польскім Гаспадарстве і далей мае кіраваць сучасны ўрад.

— Найбольш трывожныя часы пераживае цяпер **Чэхаславаччына,** якой грaзіць небясьпека з боку **Нямеччыны.** Справа ў тым, што Чэхаславаччына мае многа г. зв. нацыянальных меншасьцяў. Жыве там між іншым 3 мільёны немцаў, каторыя цяпер аб'ядналіся і йдуць за Гітлерам, які хочэ іх далучыць да **Нямеччыны,** так як зрабіў гэта з **Аўстрыяй.** Апрача таго дамагаюцца ў Чэхаславаччыне аўтаноміі **Славакі, Палякі, Украінцы і Мадзяры.** Палякоў ёсьць там паводле польскае прэсы 250 000. Каротка гаворачы, Чэхаславаччыне грaзіць падзел. Тымбольш, што **Англія** не забесьпячае яе незалежнасьці. А калі Англія ня выступіць у абароне Чэхаславаччыны, то няведама, ці зробіць гэта **Францыя,** хоць да гэтага яна быццам забавязалася. У ролі абаронцы Чэхаславаччыны выступае **СССР,** а з гэтага карыстаюць камуністы, праводзячы ў Чэхаславаччыне нябывала шырока сваю агітацыю.

— У **Гішпаніі** фашысты падмацаваныя італіянскімі і нямецкім войскам усьцяж ідуць наперад змушаючы ўрадаўцаў адступаць. Забіраюць яны ўжо Каталёнію, якая абвесьціла агульную мабілізацыю і ўсімі сіламі бароніцца. Надзеі на помач з **Францыі,** каторая аслаблена ўнутранымі забастоўкамі,бадай-што няма ніякай. **Англія-ж** быццам ужо фліртуе з ген. Франкам — павадыром гішпанскіх фашыстаў — хочучы прыцягнуць яго да сябе.

— На **Далёкім Усходзе** кітайцы ў правінцыі Шансі адбілі ад Японцаў некалькі важных ваенных пазыцыяў. Аб тым, што японцам ня надта лёгка ў Кітаі, сьведчаць, між іншым, словы старшыні японскага ўраду, які заявіў, што цяпер толькі вайна пачынаецца з Кітаем.

— 4 г. м-ца польскія газэты падалі новую вестку аб масавых арыштах у **Савецкай Беларусі.** За мінулы месяц арыштавана ў Меншчыне больш 300 сялян, а больш 500 выселена ў глыб Расеі. Вельмі многа арыштавана так-жа беларускіх нацыянальных дзеячоў, культурнікаў і вучыцялёў. Ністожаньне беларускага нацыянальнага руху, як бачым, адбываецца далей.

jn.

Dr. Jadviha i Stanisłaŭ Hrynkievičy

6)

Umovy i zahady nieabchodnyja dla zdaroŭja

Zuby i hygijena rotavaje paražni

Rot heta *prysienak* całaha stravatraŭčaha aparatu, u pieršuju-ž čarhu straŭnika. U rocie pieršy etap traŭleńnia stravy. Zależyć šmat, ci ježa budzie vykarystana arhanizmam čałavieka, ad taho, što čałaviek z jeju zrobić u rocie. Rola rotavaje paražni (jamy) šmat bolšaja, nie abmiažovana vyklučna da traŭleńnia. Mova našaja, ahulny vyhlad *estetyčny*, stulna łučycca z hygijenaju zuboŭ i rotu. Sučasnaja medycyna, asabliva amerykanskaja, pajaśniaje šmat jakich chvarobaŭ nieachajnymi adnosinami ludziej da zuboŭ.

U chvorych zubach, kažuć amerykanskija dachtary, krynica roznych chvoraściaŭ čałavieka a na't jahonaje niedoŭhaviečnaści. Biazumoŭna, što čałaviek na vioscy, chlebarob, maje lepšyja zuby, čymsia kožny žychar miesta. Umovy žyćcia viaskovaha bolš spahadajuć čyścini ŭ rotavaj paražni. Kali-b jašče krychu ruplivaści, dyk nia bačyli-b my taho, nažal, lišnie častaha źjavišča, što maładaja jšče žančyna maje ŭsiaho paru zuboŭ, nia moža ješci ničoha, jak tolki miakiš chleba i bulbu.

Dośledy vučonych jasna pakazali, što pradziedy našyja mieli zuby lepšyja ad našych. Z postupam kultury jšli adnačasna štoraz horšyja zuby. Siańnia najlepšyja zuby majuć eskimosy i hindusy. U apošnich — mo' dziakujučy abyčaju pałaskać rot paśla kožnaje jady.

Čamu zuby chvarejuć? Była ŭžo hutarka ab zaraznych chvarobach i ab malusieńkich žyviolinach, jakija vyklikajuć henyja chvaroby, h. zn. ab bakteryjach. Bakteryjaŭ i nadta roznajakich poŭna ŭ rocie. Siadziać jany spakojna, pakul čałaviek stojka trymajecca, a mohuć być pryčynaju vialikaje niebiaśpieki. Chaj łučyć taja ci inšaja niadužaść na čałavieka. dyk zaraz tyja bakteryi mohuć praz straŭnik pajści ŭ stravatraŭčy prachod, a z kišok na't łučyć u kroŭ i vyklikać śmiarotnuju chvoraść. Prysutnaść bakteryjaŭ u bolšaj miery prajaŭlajecca ŭ błahim pachu z rotu. Často niemahčyma havaryć z niekim, kali toj dychnie tolki na vas. Henyja-ž bakteryi vyklikajuć zaciažnyja katary kišok, nie dajučy mahčymaści vykarystać stravy ŭ arhaniźmie.

(*d. b.*)

Z biełaruskaha žyćcia

Śviatkavańnie 20-ch uhodkaŭ aktu 25.III.1918 h. Z pryčyn vonkavych, ad biełarusaŭ niezaležnych, śviatkavańnie ŭhodkaŭ abvieščańnia Niezaležnaści Biełarusi nia było tak arhanizavana, jak paru hod tamu nazad. Adnak biełarusy hety dzień jak mahli, tak adznačali. Asabliva atrymali my pryjemnyja viestki z Łatvii, dzie moładź vielmi ŭmieła i ŭdała arhanizavała śviatkavańni 20-ch uhodkaŭ abvieščańnia niezaležnaści Biełarusi. Byli tam ładžany pa vioskach pradstaŭleńni, lekcyi, viečary. Aprača taho była naładžanaja abjezdnaja vystaŭka biełaruskaje presy, jakaja adviedała šmat miascoŭ. Za heta maładym našym bratom u Łatvii čeść i sława!

Z nahody 20-ch uhodkaŭ aktu 25.III biełaruskaja presa pamiaściła adpaviednyja artykuły. Byli takija artykuły ŭ „Шляху Моладзі" №7 i 8 i ŭ „Chryśc. Dumcy" №9.

Z nahody 20-ch uhodkaŭ aktu 25.III nadyjšli na ruki paasobnych biełaruskich dziejačoŭ u Vilni pryvitańni jak z kraju, tak i z zahranicy.

Z nahody 20-ch uhodkaŭ aktu 25.III adbyłosia ŭ niadzielu 27.III u kaściele św. Mikałaja nabaženstva. Na hetym nabaženstvie aprača biełarusaŭ byli tak-ža litoŭcy i ukraincy. Śv. Imšu adpraviŭ i skazaŭ kazańnie Ks. Adam Stankievič. Pramoŭca miž inšym padčyrknuŭ, što najlepšaj pašanaj dla aktu 25.III budzie naš žyvy i dziejny patryjatyzm, jaki maje vyražacca: 1. u paznavańni biełaruskaha narodu — jaho ziamli, historyi, kultury i charaktaru; 2. u baraćbie z błahimi prajavami charaktaru bieł. narodu i ŭ raźvivańni i ŭćviardžańni dobrych prajavaŭ hetaha charaktaru; 3. u pracy našaj nad usiebakovym raźvićciom biełaruskaj kultury i nad stvareńniem biełaruskaj ekanomiki. Hetki-ž biełaruski tvorčy patryjatyzm, kazaŭ urešcie pramoŭca, maje apiracca nie na chvorych i pierachodnych idejach šovinizmu, rasizmu, totalizmu, ale na viečnych idejach zdarovaha chryścijanskaha demakratyzmu, jaki, vučačy nas lubić svoj narod, vuča tak-ža dobrych i spraviadlivych adnosinaŭ i da čužych narodaŭ i da ich kultury.

Uračystaja akademija, pryśviačanaja 20-m uhodkam aktu 25.III. adbyłasia 25.III sioleta ŭ Prazie Českaj. Referat čytaŭ Namieśnik Staršyni Rady Biełaruskaj Narodnaj Respubliki hram. V. Zacharka.

Памятайма аб незаможнай беларускай моладзі

Грамадзяне!

Прыбліжаюцца Вялікодныя Сьвяты. Кожны стараецца чымнебудзь іх адзначыць. Усе ўзаемна выражаюць сабе найлепшыя пажаданьні, ладзяцца прыняцьці, пачэсткі (пачастункі), ня мала пры тым ідзе грошаў на бескарысную гарэлку. Увялі так-жа людзі ў гэты час вельмі прыгожы звычай складаньня ахвяраў на бедных, на дабрадзейныя, а так-жа і культурна-асьветныя арганізацыі. У беларускім грамадзкім жыцьці звычай гэты дасюль, на жаль, яшчэ ня ўведзены. Тымчасам ён патрэбны. — Гляньма толькі, як жыве беларуская вучнёўская і студэнцкая моладзь, як яна гаруе, часта нават галадуе. Гляньма, колькі марнуецца маладых здольных людзей, дзеля таго толькі, што ня маюць матарыяльнае магчымасьці йсьці ў сьвет, плаціць за школу, пражыць у месьце і г. д. А колькі-ж грошаў у беларусаў ідзе фармальна ў балота, на беспатрэбшчыну, як гарэлку і курэньне!

Вось-жа, ладзячы вялікодныя сьвяткаваньні, пачэсткі, візыты, высылаючы прывітаньні, трэба памятаваць і аб беларускай незаможнай, але здольнай вучнёўскай і студэнцкай моладзі. Няхай хоць частка прадбачаных сьвяточных выдаткаў будзе прызначана на падтрыманьне беларускай моладзі. Хто колькі можа, няхай зложыць-прышле сваю ахвяру на дапамаговы фонд беларускай незаможнай, але здольнай вучнёўскай і студэнцкай моладзі пры „Шляху Моладзі": Вільня, Завальная 1—2.

Трэба так-жа каб моладзь ідучы на вёсцы ў валоўнікі сьпявала беларускія вялікодныя песьні і каб хоць частку сабранага даходу прызначала на дапамогу бел. незаможнай моладзі, якая вучыцца.

Рэдакцыйная Калегія „Шляху Моладзі"

Вільня, Красавік 1938 г.

НА ДАПАМАГОВЫ ФОНД БЕЛ. МОЛАДЗІ пры „ШЛ. МОЛ." ахвяравалі: Г. Ш. 1.50 зл., П. Лубочко 1 зл., В. Крако 0.50 зл., Гал. Янкоўская 1 зл., Ст. Станкевіч 2 зл.— Усім шчыра дзякуем.

Першую помач з фонду атрымаў малады здольны, незаможны бел. скрыпач, які вучыцца ў аднэй з музычных школаў у нашым краі.

Рэдакцыя „Шл. Мол."

Žałobnaja akademija ŭ česć P. Krečeŭskaha. Biełaruski Studencki Sajuz 26.III ładziŭ žałobnuju akademiju ŭ česć P. Krečeŭskaha z nahody 10-ch uhodkaŭ jaho śmierci. Prahrama akademii była takaja: 1. ustupnoje słova staršyni Sajuzu Ad. Dasiukievića, jaki ahulna padčyrknuŭ zasłuhi P. Kr. i zaprapanavaŭ prysutnym ušanavać jaho pamiać ustavańniem i chvilinaj maŭčańnia; 2. student Č. Najdziuk pračytaŭ referat na temu: „P. Krečeŭski, jak symbol biełaruskaje niezaležnickaje dumki"; 3. studentka Suchaja deklamavała vieršy, jakija pisaŭ P. K. i 4. inž. Ad. Klimovič padzialiŭsia z prysutnymi svaimi asabistymi ab P. K. uspaminami.

U bieł. skaŭtaŭ u Vil. Bieł. Himnazii, 24.III, z pryčyny ŭhodkaŭ ich isnavańnia, adbyŭsia viečar. Byŭ referat, pramovy, kancert, tavaryskaja harbatka. Viečar prajšoŭ u pryjemnym nastroi i zrabiŭ na ŭčaśnikaŭ pryjemnaje ŭražańnie. Asabliva dobra papisvałasia na viečary dziaŭčackaja 18 družyna bieł. skaŭtak, jakoj pamatčynamu apiakujecca hram. A. Lekant-Sakałova. Z žalem treba adznačyć, što skaŭtynham nia cikaviacca vučni starejšych klasaŭ bieł. himnazii, katoryja pavinny być pašyralnikami pryhožaje skaŭckaje idei siarod bieł. moładzi.

29.III. stud. Č. Najdziuk pračytaŭ skaŭtam referat ab žyćci i dziejnaści Piotry Krečeŭskaha.

Z žyćcia biełarusaŭ u Varšavie. 26.III. sioleta ŭ Aśvietnym T-vie Biełarusaŭ u Varšavie hram. Orsa pračytaŭ referat na temu: „Ahulny narys raźvićcia biełaruskaje litaratury". Paśla adbylisia deklamacyi vieršaŭ bieł. paetaŭ. Deklamavali hr-nie: Šydłoŭski i Duduško. — Pry hetym padajecca da viedama, što Aśviet. T-va Biełarusaŭ mieścicca ŭ Varšavie ŭžo pry vul. Świętokrzyskiej 9 m. 18.

Z žyćcia biełarusaŭ u Koŭnie. 27.II 1938 h. u Koŭnie adbylisia hadavyja schody siabraŭ Biełaruskaha Kulturna-Aśvietnaha Tavarystva i Nacyjanalnaj Suviazi Biełarusaŭ u Litvie.

Pakinuŭ svoj kraj. Ks. dr. J. Rešeć, viedamy biełaruski dziejač, aŭtar niekalkich biełaruskich knižak, 27.III vyjechaŭ u Złuč. Št. Ameryki.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.



Нябывала трывожныя і сумныя весткі

Ня раз ужо ў „Шляху Моладзі“ друкаваліся карэспандэнцыі з розных куткоў нашага краю аб пашырэньні п'янства і страшных яго насьледках. Ніколі аднак так вялікай колькасьці карэспандэнцыяў аб п'янстве ня было, як сёлета. Вось, апошнімі днямі атрымалі мы *8 карэспандэнцыяў* з розных паветаў, якія адна ў адну крычаць голасам роспачы *аб страшэнным жніве гарэлкі.*

І так, *Т. Кап* на двох аркушох паперы апісвае пашырэньне п'янства, ігры ў карты і цемры ў Шчучынскім павеце. *Я. Л.* паведамляе аб вялікім пашырэньні п'янства ў некаторых воласьцях на Палесьсі. *Каровапас* піша, што ў Лашанскай воласьці каля Горадні моладзь апрача гарэлкі і картаў нічога больш ня бачыць. Сумныя карэспандэнцыі аб п'янстве, разбоях і распусьце прыслалі з Баранавіцкага павету *Д. Дудар і І. Маркотны.* Ня менш сумную карэспандэнцыю атрымалі мы так-жа з Маладэчанскага пав. ад *Я. Клачка.* Караспандэнт з Пастаўскага павету піша, што ў в. Старыя Габы на гэтулькі гарэлка запанавала, што прадаюць яе нават у коопэратыве — што ёсьць проста недапушчальным. *В. Лёгкі* піша, што ў Наваградчыне, дзе моладзь энэргічна вядзе саматужна барацьбу з п'янствам, курэньнем і картамі, некаторыя прадажныя адзінкі стараюцца нагаварваць моладзь да таго, каб „жыць весялей“ і выпіваць.

Прачытаўшы такія карэспандэнцыі, паўстае страшнае пытаньне: да чаго гэта давядзе? — Бо-ж з п'янствам пашыраецца разбой, разлад, дэмаралізацыя, грызьня, суды, цемра і адначасна напаўняюцца вастрогі крымінальнымі праступнікамі. — Бо-ж гарэлка — алькаголь атручвае людзкі арганізм і вядзе цэлыя пакаленьні да карлавацізны духовай і фізычнай, а таксама ністожыць матар'яльна.

Дзе-ж прычыны гэтага п'янства? — На гэтае пытаньне знаходзім адказ у тых-жа карэспандэнцыях, аўтары якіх у адзін голас цьвердзяць, што галоўнай прычынай пашырэньня п'янства і цемнаты зьяўляецца нястача на вёсцы беларускіх культурна-асьветных арганізацыяў, каторыя зацікаўлялі-б моладзь культурнай працай. Пры тым усе сьцьвярджаюць, што пакуль існавалі беларускія культурныя арганізацыі, вёска паступова йшла да лепшага, сьвятлейшага жыцьця. Цяпер-жа, калі вядзецца дзе-небудзь барацьба з п'янствам, то робяць гэта сьвятлейшыя беларускія ідэовыя адзінкі, бо ўсе беларускія культурныя арганізацыі на вёсцы зьліквідаваныя. Польскія-ж арганізацыі належна ў гэтым кірунку не працуюць. — Дзеля таго беларускае грамадзянства, беларускі культурны цэнтр павінны ў найбліжэйшым часе падумаць аб пляновай саматужнай барацьбе з п'янствам, ці мо' найлепш было-б пачаць стараньні і залажыць беларускую арганізацыю цьвярозасьці, якая сапраўды належна павяла-б барацьбу з страшнай праявай п'янства. На гэту справу павінна так-жа зьвярнуць увагу бел. прэса і зьмяшчаць адпаведныя матарыялы, каторыя-б выясьнялі людзям усю шкоднасьць гарэлкі. Адначасна кожны сьведамы беларус павінен старацца як найбольш пашыраць беларускія часапісы і кніжкі, бо і часапіс і кніжка такжа людзей накіроўваюць да культурнейшага жыцьця. Кожны беларус на кожным кроку павінен дбаць аб тое, каб Народ Беларускі быў цьвярозым, сьветлым і йшоў да лепшага заўтра, каб доля ягоная паправілася.

Рэдакцыя.



Što vyvieziena zahranicu. U m-cy studni siol. vyvieziena z našaha kraju ŭ Anhliju, Niamieččynu i Švajcaryju 785 klh. hryboŭ sušanych i kala 200 klh hryboŭ kanservavanych u Anhliju. Lekarskich ziołak 23,600 klh. u Anhliju, Aŭstryju, Belhiju, čechasłavaččynu, Francyju, Niamieččynu i U.S.A.; žuravinaŭ — 5000 klh. u Francyju; šviniej u Niamieččynu 186 tysiač klh; šeršci, taksama ŭ Niamieččynu—16,500 klh; cialačych skurak 10,000 štuk; zajčych skurak 15,500 štuk; skuranych rukavicaŭ na ahulnuju sumu 53,000 zł. Aprača taho vyvieziena bolš 330 koniaŭ ahulnaj vartašci 113,000 zł.

Špieŭ piasku. Ab špievie piasku ŭ pustyniach zdaŭna raskazvajuć turysty, ab hetym špievie paŭstali celyja lehiendy. Ciapier henaje zahadačnaje źjavišča vyjašniaje navukova inž. Walter Kegelhetan: U pustyniach piasok nahravajecca ad sonca vielmi mocna; pad dziejańniem temperatury piaščynki piasku źmianiajuć svajo pałažeńnie z pryčyny rasšyrańnia, abo zvužańnia. Padčas henaje niaznačnaje źmieny pałažeńnia milijardaŭ piaščynkaŭ u pustynnym mory piasku paŭstaje hłuchi šorach, vyklikany cierciem piaščynkaŭ adnej kala druhoj. Hety šorach źlivajecca ŭ adzin ton, jaki prazyvajuć „špievam“ piasku.

Паштовая скрынка

М. Вольнаму: Цэннае Вашае пісьмо атрымалі. Цешымся, што ўсё ў Вас ідзе добра. Карэспандэнцыяў ня друкуем, бо баімся, каб не зашкодзіць... Вашай карыснай працы. Вам і ўсім Вашым Сябром засылаем найлепшыя пажаданьні і гарачае прывітаньне!

В. З. і П. Л.: Атрымалі, дзякуем, у меру магчымасьці будзем карыстаць.

Жалейцы: Брава! Вітаем з поступам і новымі творамі. Прысланае, як бачыце друкуем. Чакаем больш!

Я. Астроўскаму, Клачку, Л., Т. Капу: Карэспандэнцыі выкарыстываем толькі як весткі, а не друкуем, бо яны зьбягаюцца точна з іншымі карэспандэнцыямі аб п'янстве і картах. Просім пісаць і на іншыя тэмы.

П. Луб—ку: Падпіска за 1938 г. у Вас аплачана ўжо поўнасьцю.

А. Сучку, Бунтарнаму, Макошцы, Білю і М. Кліну: Вершы, нажаль, слабыя і да друку не падходзяць. Радзім больш над сабой папрацаваць, чытаць як найбольш беларускае паэзіі, пазнаць добра беларускую грамату, прыглядацца, як пішуць іншыя, а пасьля тварыць свае арыгінальныя вершы. Усім прывітаньне!

Я. Чорнаму: Атрымалі, у меру магчымасьці будзем выкарыстываць.

Ždanu M.: „Šlach Mоł.“ vysyłajem vam akuratna, damahajciesia na pošcie. My z svajho boku źvierniemsia z skarhaj u Dyrekcyju Poštaŭ.

Hančaryku Ul. Radzim źviarnucca ŭ Biełaruskuju Himnaziju ŭ Vilni: Daminikanskaja vul. 3. Pamahčy nia možam.

Мілюцю, Брылю і Кунашаніну: Адказ будзе ў наступн. нумары.

„Шлях Моладзі“ рэдагуе Рэдакцыйная Калегія. Друкуецца ў Беларускай Друкарні ім. Фр. Скарыны ў Вільні (Завальная 1-2) коштам працы: Я. Багдановіча, Я. Найдзюка і А. Шутовіча.

Адрыс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца № 1—2 (Wilno, Zawalna 1—2).

„ШЛЯХ МОЛАДЗІ“ выходзіць два разы ў месяц: 5 і 25. Падпіска на год 2 зл. і 50 гр., на паўгода 1 зл. 50 гр., на 3 мес.—75 гр
Цана аднаго экзэмпляра 15 грошаў. — Заграніцу ўдвая даражэй. — Нумар картатэкі „przekazu rozrachunkowego“ 59.

Рэдактар: Я. НАЙДЗЮК.

Выдавец: „БЕЛПРЭС“.

